

## Арлоў Фёдар Міхайлавіч
## (Цівунчык Феафіл Міхайлавіч)

(1878, в. Цецяроўка Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ. – 1953, Масква) - савецкі военачальнік, палкоўнік, удзельнік чатырох войнаў: руска-японскай, Першай сусветнай, грамадзянскай у Расіі і Вялікай Айчыннай. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі стаў чырвоным камандзірам. З 1921 г. – камандуючы Харкаўскай ваеннай акругі, у 1923 г. – памочнік камандуючага войскамі Украіны. 1931-1935 гг. – намеснік начальніка асобага канструктарскага аддзела ваенна-тэхнічнай прапаганды РСЧА. З ліпеня 1941 г. Ф.М. Арлоў – камандзір роты 6-й дывізіі народнага апалчэння, удзельнічаў у фарміраванні 160-й стралковай дывізіі, якую ўзначаліў са снежня 1941 г. Вайну скончыў у званні палкоўніка. За баявыя заслугі камдзіў Арлоў быў узнагароджаны трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга (1920 г., 1942 г., 1944 г.) і Ордэнам Айчыннай вайны I ступені (1943 г.), Ордэнам Леніна (1946) і медалямі СССР.



Вуліца ў аг. Пагранічны Бераставіцкага раёна названа ў гонар сям'і Арлова (Цівунчыка) Фёдара Міхайлавіча (1878-1954), савецкага военачальніка, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнца в. Цецяроўка Бераставіцкага раёна.



Фёдар Міхайлавіч нарадзіўся ў в. Цецяроўка Гродзенскай губерні ў 1878 г. З 1899 па 1905 гады служыў радавым у гвардзейскім уланскім палку. Скончыўшы вучэбную каманду, стаў унтэр-афіцэрам, прымаў удзел у Руска-японскай вайне, затым у Першай сусветнай. У 1903 г. Фёдар Міхайлавіч ажаніўся з Марыяй Міхайлаўнай Арловай, разам з ёй прайшлі руска-японскую вайну, Першую сусветную.

Пасля службы ў царскай арміі застаўся працаваць ў Петраградзе, удзельнічаў у рэвалюцыйных падзеях 1917 г. У сувязі з тым, што блізкія сваякі засталіся на тэрыторыі Польшчы, змяніў прозвішча Цівунчык на Арлоў.

З пачаткам рэвалюцыі былы унтэр-афіцэр стаў камандзірам Выбаргскага атряда чырвонагварзейцаў, удзельнічаў у штурме Зімняга палаца, галасаваў за першы Дэкрэт Савецкай Рэспублікі аб Міры. Быў накіраваны на Паўночны Каўказ для арганізацыі чырвонагвар-дзейскіх і партызанскіх атрадаў. Вясной 1918 года назначаны камісарам Кубан-скага войска, удзельнічаў ў барацьбе з контррэвалюцыяй на Кубані, абараняў Царыцын, вызваляў Крым. За баявыя заслугі і подзвігі ён неаднаразова ўзнагароджваўся каштоўнымі падарункамі, у тым ліку — залатым імянным партсігарам.



Браты па зброі. Злева Ф.М. Арлоў (Цівунчык)

У 1920 г. Фёдар Міхайлавіч Арлоў быў узнагароджаны першым ордэнам Чырвонага Сцяга. Ён быў саратнікам М. В. Фрунзэ ў баях супраць Урангеля. За заслугі перад Айчынай Фрунзэ ўзнагародзіў Фёдара Міхайлавіча ганаровай зброяй – залатой імяннной шашкай.

З 1924 па 1931 г. па стану здароўя (у гады Грамадзянскай вайны атрымаў 24 ранення і кантузіі) Арлоў знаходзіўся ў рэзерве РСЧА.

Калі ў чэрвені 1941 г. на нашу Радзіму напалі фашысты, старшыні Савета народных камасараў тав. Молатаву і Народнаму камісару абароны тав. Цімашэнка ад Фёдара Міхайлавіча Арлова 22 чэрвеня 1941 г. паступіла заява, ў якой гаварылася: *«Вы меня хорошо знаете по боевой работе в Красной Армии в дни гражданской войны. Теперь я уже вступаю в ряды Красной Армии не один, а со своей семьей. Нас 5 человек и нам враг не страшен. Если понадобится, то мы и жизнь отдадим, но врага победим. Я, как патриот своей Родины, прошу удовлетворить мою просьбу, ибо я буду нервничать и болеть, что не смогу отдать свою кровь и жизнь на разгром врагов нашей необъятной Родины»*.

У чэрвені 1941 г. Фёдар Міхайлавіч з'явіўся на мабілізацыйны пункт народнага апалчэння, але атрымаў адмову, яму было ужо 63 гады. Але після настойлівых просьбаў быў запісаны ў апалчэнцы радавым. Пазней камандаваў ротай, разведвальным батальёнам 6-й дывізіі народнага апалчэння. Удзельнічаў у баях пад Ельняй, атрымаў два раненні, кантузію, але застаўся ў страі. Удзельнічаў у арганізацыі збору і паўторнага фарміравання 160-й стралковай дывізіі, якую ўзначаліў 25 кастрычніка 1941 года.

29 студзеня 1942 года ў раёне населенага пункта Грыдзенкі Калужскай вобласці Арлов у выніку налёту нямецкай авіяцыі атрымаў дваццаць пятае па ліку раненне. Але ўжо ў жніўні 1942 года зноў вярнуўся ў войска і толькі ў 1946 годзе быў звольнены з ваеннай службы ў званні палкоўніка. За ўмелае камандаванне, праяўленыя доблесць і мужнасць падчас Вялікай Айчыннай вайны быў узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонага Сцяга (1942, 1944 г.) і ордэнам Айчыннай вайны (1943 г.).



Сям’я Арловых. Злева направа: Уладзімір, Марыя Іосіфаўна, Фёдар Міхайлавіч, стаяць Васілій, Яўген і Марыя

Жонка Арлова Марыя Іосіфаўна ў 1944 годзе была ініцыятарам пабудовы на сродкі сям’і Арловых танка Т-34. Танк атрымаў назву «Маці-Радзіма». На гэта пайшлі ўсе зберажэнні, у тым ліку залаты партсігар — імянная ўзнагарода Фёдара Міхайлавіча. Па просьбе Марыі Іосіфаўны баявая машына была накіравана ў часць, дзе служыў яе малодшы сын Васіль. Экіпаж танка за час вайны знішчыў 17 штук варожай зброі, 9 танкаў, 18 аўтамашын.



М.І.Арлова. 1960-я гг.

Дзеці Ф.М. Арлова пайшлі дарогай свайго бацькі. З першых дзён вайны — яны ўсе на фронце.

У верасні 1941 г. сям'я панесла цяжкую страту: у баях пад Ленінградам паў смерцю храбрых старэйшы сын Уладзімір. Будучы інжынер, студэнт 4-га курсу Ленінградскага тэхнічнага інстытута, стаў дабравольцам народнага апалчэння і абараняў Ленінград.

Вялікі шлях па дарогах вайны прайшоў і Яўген Арлоў. На пачатку вайны Яўген служыў на Далёкім Усходзе. У 1942-м даведаўся аб смерці жонкі і дзяцей у блакадным Ленінградзе. І вырашыў – толькі на фронце я змагу адпомсціць ворагам. Капітан, камандзір роты супрацьтанкавай зброі за баявыя заслугі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцягу, дзвюма ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, медалямі за ўзяцце Прагі і Берліна.

Дачка Арловых, Марыя Фёдараўна, перад вайной закончыла Ваенна-паветраную акадэмію імя Жукоўскага. Цэлы год яна ваявала ў складзе праслаўленага жаночага палку Героя Савецкага Саюза Марыны Раскавай. Іх называлі «начнымі ведзьмамі».


В.Ф. Арлоў

Палкоўнік Васіль Арлоў камандаваў танкавым палком, затым брыгадай. Энергічны, рашучы, любімец танкістаў, ён славіўся адважнымі рэйдамі ў тыл праціўніка. За баявыя подзвігі быў узнагароджаны трыма ордэнамі Чырвонага Сцягу і ордэнам Суворава II ступені. Удзельнічаў у баях пад Ржэвам, на Курскай дузе, у аперацыі «Баграціён». 28-гадовы Васіль Арлоў у 1944 г. камандаваў ужо 6-м гвардзейскім механізаваным корпусам. Яму не давялося дажыць да дня Перамогі. У сакавіку 1945 года корпус В.Ф. Арлова фарсіраваў Одэр і рваўся да Берліну. У жорсткім баі палкоўнік атрымаў смяротнае раненне і праз некалькі дзён памер. Па загадзе маршала Конева труна з целам героя была дастаўлена ў Маскву, дзе яго пахавалі на Новадзевічых могілках. Пасмяротна В.Ф. Арлову было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. За незвычайную смеласць і рашучасць, уменне тактычна весці баявыя дзеянні Васіль быў узнагароджаны амерыканскім ордэнам Ганаровага легіёну.

Памёр Фёдар Міхайлавіч Арлоў (Цівунчык) у 1953 годзе. Пахаваны на Новадзевічых могілках у Маскве.




Магіла Ф.М. Арлова (Цівунчыка) на Новадзевічых могілках у Маскве

# *У гонар камдзіва Ф.М. Арлова (Цівунчыка)*

Імем камандзіра дывізіі народнага апалчэння названа вуліца на поўначы Масквы недалёка ад Батанічнага саду. Кожны год у Дзень Перамогі вучні школы раёна, у якім знаходзіцца вуліца Камдзіва Арлова, прыносяць кветкі да мемарыяльнай дошкі і праводзяць урачыстую лінейку ў памяць аб героі.




Імем сям'і Цівунчык-Арловых названа вуліца на малой радзіме Фёдара Міхайлавіча Арлова (Цівунчыка) ў аг. Пагранічны Бераставіцкага раёна Гродзенскай вобласці (Рэспубліка Беларусь).



Вуліца імя сям'і Цівунчык-Арловых ў аг. Пагранічны

## Бібліяграфія

**Арлоў (Цівунчык) Ф.М.**

1. Цівунчык Феафіл Міхайлавіч (Арлоў Фёдар Міхайлавіч) // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Бераставіцкага р-на. – Мінск: БЕЛТА, 1999. – С.121;
2. Турок, Л. Камдзіў Арлоў – наш зямляк / Людміла Турок // Бераставіцкая газета. – 2018. – 3 чэрвеня;
3. Горицкий В.А. Великая Отечественная война 1941-1945 годов в названиях улиц Москвы. М.: ОАО "Московские учебники и картолитография", 2005. С. 74.
4. Орлов Фёдор Михайлович - Бессмертный полк – Москва: [Электронный ресурс]. URL:http://www.polkmoskva.ru/people/754615/. - Дата обращения 29.06.2019;
5. Комдив Орлов - забытый герой: [Электронный ресурс]. URL: http: //fb.ru/article/403365/komdiv-orlov---zabyityiy-geroy. - Дата обращения 29.06.2019;
6. Орлов, Фёдор Михайлович — Википедия: [Электронный ресурс]. URL: http: // ru.wikipedia.org/wiki/Орлов,_Фёдор_Михайлович. – Дата доступа;

Матэрыял з кнігі “Ганарыся сваім імем, вуліца!”.
Аўтар-складальнік В.І. Чыкун